# Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай літаратуры рубяжа XIX – XX стагоддзяў»

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята<br>(агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя. Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская)<br>Цыкл спецыяльных дысцыплін: дзяржаўны кампанент<br>Модуль «Гісторыя беларускай літаратуры» |
| **Кароткі змест** | Новыя метадалагічныя прынцыпы перыядызацыі літаратурнага працэсу. Літаратура перыяду рубяжа XIX – XX стагоддзяў і яго дзеячы. Фарміраванне сучаснай сістэмы жанраў. Развіццё літаратурна-эстэтычнай думкі. Узаемадзеянне розных творчых метадаў. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку паспяховага засваення дысцыпліны студэнт павінен: ***ведаць*****:** развіццё літаратуры рубяжа XIX – XX стагоддзяў; узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці творчай манеры; канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульна-чалавечае значэнне мастацкіх твораў; сучасныя ацэнкі мастацкіх з’яў перыяду; праблематыку, ідэйны змест твораў, асаблівасці кампазіцыі, вобразна-выяўленчыя сродкі; герояў твораў, іх светапогляд, рысы характару, месца ў сістэме вобразаў; звесткі пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў; ***умець*****:** выяўляць агульнае і адрознае ў літаратуры рубяжа XIX – XX стагоддзяў і папярэдніх эпох; спалучаць тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных мастацкіх з’яў; упісаць літаратурны твор у сацыякультурны кантэкст эпохі; вызначыць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і літаратуры свайго часу; скласці тэсты па творах, фактах жыццёвага і творчага шляху аўтара; каменціраваць тэксты твораў, характарызуючы іх з культуралагічнага, гісторыка-бытавога, літаратуразнаўчага і іншых аспектаў; працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай; ***валодаць*****:** адпаведным паняційным і літарату-разнаўчым апаратам; сучаснай метадалогіяй і методыкай літаратуразнаўчых даследаванняў; навыкамі разнастайных спосабаў аналізу мастацкіх твораў.<br>Патрабаванні да прафесійнай **кампетэнтнасці** спецыяліста: БПК-13. Характарызаваць асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай літаратуры ў аспекце родавай і відавай прыналежнасці мастацкіх твораў, асаблівасцей іх паэтычнай і стылістычнай арганізацыі. |
| **Прэрэквізіты** | Гісторыя беларускай літаратуры XIX ст. Гісторыя рускай літаратуры. Гісторыя замежнай літаратуры. Тэорыя літаратуры. |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 108 акадэмічных гадзін, з іх 60 аўдыторных: 30 гадз. лекцый (з іх 6 КСР) і 30 гадз. практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 4 семестр, калоквіум, тэст, экзамен |